Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

13 лютага 2015 года, № 2 (2126)

ПАДЗЕЯ

Як жывецца ў «тройцы»?

Пакуль за акном пануе яшчэ зімовае надвор'е, надвор'е ва ўнутраным свеце БДУ становіцца цяплейшым і ўтульнейшым, а сям'я студэнцкага гарадка і інтэрнатаў павялічваецца. Зараз у больш як 1100 студэнтаў БДУ ёсць новы дом, новае месца, дзе можна сагрэцца халоднымі яшчэ зімовымі вечарамі.

Фота Святланы ПАЛАВЕЦ

Да пачатку новага семестра студэнты БДУ атрымалі падарунак – адкрыццё новага інтэрната. 12 студзеня пасля капітальнага рамонту свае дзверы для студэнтаў адчыніла доўгачаканая «тройка». Але нічога ўсярэдзіне і знадворку будынка не нагадвае пра тое, што самому інтэрнату ўжо 40 гадоў. 13 паверхаў, 24 кухні, 2 ліфты, новая мэбля і тэхніка, утульнае хатняе абсталяванне – усё гэта і не толькі зроблена для большага камфорту студэнтаў вядучага ўніверсітэта краіны.

Гэтай зімой у інтэрнат будуць заселены студэнты розных факультэтаў: біялагічнага, механіка-матэматычнага, гістарычнага, юрыдычнага, факультэта журналістыкі і іншых. Мабыць, гэта ўжо стала своеасаблівай традыцыяй – «замкадцзе» аб'ядноўвае ўвесь універсітэт. Ужо падчас сесіі ў інтэрнат № 3 пачалі засяляцца першыя жыхары: невялікая чарга, пара папер, рэгістрацыя – і ты жыхар «тройкі». Вядома, самае поўнае засяленне інтэрната адбудзецца напачатку новага навучальнага семестра. А мы пагаварылі з тымі, хто ўжо засяліўся і абжывае свае новыя пакоі.

Трубяцкі Павел: «Мне падабаецца маё новае месца жыхарства. Вядома, складана меркаваць, як тут будзе, калі заселіцца ўвесь паверх, але пакуль нас тут ужо трое, поўны камплект для пакоя, чакаем суседзяў па блоку. Досыць асабістай прасторы, добры выгляд на горад, цешыць, што засялілі разам са сваім факультэтам. Ёсць яшчэ пара нявырашаных пытанняў, напрыклад, пра інтэрнэт і паліцы для кніг, але тут усё залежыць ад нашай ініцыятывы».

Яўген Будрык: «Я вучуся на трэцім курсе і ўпершыню засяліўся ў інтэрнат, вельмі задаволены. У многіх можа ўзнікнуць здзіўленне ў стылі «ну вас жа там шмат, як у санаторыі і г. д.», на такія заўвагі мне ёсць што адказаць. Да таго, як заехаць у «тройку», я жыў на здымнай кватэры, а ўмовы там былі далёка не пяцізоркавыя, ды і жыў я таксама не адзін. Паспрабаваў заехаць самым першым у пакой, каб абраць самае лепшае месцейка. Ужо троху папрацаваў на карысць інтэрната. Галоўнае, што я паспеў зразумець: інтэрнат – гэта зносіны. Тут ёсць дзве агульныя кухні на паверх, так што з часам усе пазнаёмімся. А ў суседнім інтэрнаце ёсць сталовая, гэта, напэўна, для тых, хто не хоча знаёміцца на кухні. А яшчэ я чуў, што нам абяцалі ў хуткім часе адкрыць трэнажорную залу, чакаем».

Інтэрнат № 3, як і іншыя інтэрнаты БДУ, са сваім статутам, правіламі і асаблівасцямі. У холе ля ўваходу стаяць мяккія канапы, вісіць стэнд з інфармацыяй пра студэнцкі гарадок БДУ і агульныя палажэнні. Упершыню засяляючыся ў інтэрнат, як дзіця, цешышся кожнай дробязі. Ты атрымліваеш ключы ад пакоя, а яшчэ падушку, коўдру і шматлікае іншае. Асабліва ўразіў жыхароў інтэрната кілімок ля ўваходных дзвярэй – самая нечаканая з атрыманых у камплекце рэчаў.

Інтэрнат не новы, ён атрымаў «другое нараджэнне». У першы тыдзень «тройка» працавала ў спецыяльным рэжыме: першыя жыхары тэставалі ўсё што маглі. Кухні, душы, вокны, дзверы, пліты, навучальныя пакоі, разеткі – усё праверана і ацэнена. Утульныя пакоі, еўравокны з шырокімі падваконнікамі, батарэі з самастойным выбарам цеплавога рэжыму, пакоі самападрыхтоўкі на кожным паверсе... толькі пражыўшы пару дзён у гэтай атмасферы, пачынаеш разумець, як гэта выдатна. А пагутарыўшы з тымі, хто жыў тут да гэтага, усведамляеш, якая вялікая праца была праробле на.

Хуткім часам жыхароў інтэрната № 3 чакае яшчэ некалькі прыемных неспадзевак, сярод якіх адкрыццё трэнажорных, тэнісных і фітнэс-залаў, а таксама з'яўленне мікрахвалёўкі на кухнях.

Вось так жывуць студэнты ў тройцы, абжываюцца і чакаюць усіх цікаўных у госці, на гарбату.

Вольга ШАНЧУК,
грамадская інфармацыйная служба студгарадка

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ПА ІНТЭРНАЦЕ №3:

- колькасць месцаў – 1172
- трэнажорная зала
- фітнес зала
- 2 пакоі для заняткаў настольным тэнісам
- 4 чытальныя залы
- пакой для навучальных заняткаў
- пакой самападрыхтоўкі
- відэасалон
- буфет КГХ БДУ
- гандлёвы кіёск
- пральня

Чытайце ў нумары:

БАРАЦЬБА ЗА ЖЫЦЦЁ
Нарыс пра вучонага-радыёфізіка Аляксандра Коўрыкава, стваральніка электрамагнітнай гіпертэрміі
Стар. 2

КАФЭ-БІСТРО Ў БДУ З ГУЛЬНЯМІ І... ПЛЕДАМ
Новы дырэктар камбіната грамадскага харчавання БДУ Жанна ВАРАНКЕВІЧ адразу пачала пераўтвараць яго дзейнасць
Стар. 3

ПРЫЕХАЛІ НА СПАРТАКІЯДУ, А ПАТРАПІЛІ НА КАНЦЭРТ
Чарговая спартакіяда адміністратыўна-кіраўніцкага персаналу атрымала нечаканае завяршэнне
Стар. 4

НА ЎКЛАДЫШЫ ГАЗЕТЫ
чытайце цікавосткі
ад Псіхалагічнай службы БДУ

Весткі з рэктарата

РЭКТАР БДУ акадэмік НАН Беларусі *Сяргей Абламейка* абраны замежным членам (акадэмікам) Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук (РАЕН) па аддзяленні «Матэматыка і матэматычная фізіка». Ён адзначаны за важкі ўклад у даследаванні ў галіне інфарматыкі, апрацоўкі малюнкаў і распазнавання вобразаў. Званне замежнага члена РАЕН маюць 49 навукоўцаў розных краін з сусветнымі імёнамі.

* * *

ДАМОВУ аб супрацоўніцтве заключылі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і рэктар *Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ* Марат Жылінскі. Гаворка ідзе пра прыцягненне вядомых навукоўцаў да заняткаў, уцягванне студэнтаў у даследчую дзейнасць, а таксама пра абмен досведам у арганізацыі практычнай і навуковай працы.

* * *

ГАНАРОВАЙ граматай Нацыянальнага сходу РБ узнагароджаны прарэктар па эканоміцы і інавацыях БДУ *Уладзімір Панарадаў* за вялікі ўнёсак у рэалізацыю сацыяльнай і эканамічнай палітыкі Беларусі.

* * *

ЗВАННЕМ «Заслужаны работнік БДУ» ганараваны сем супрацоўнікаў. Гэта загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта *Рыгор Васілевіч;* загадчык лабараторыі кандэнсаваных асяроддзяў НДІ ФХП *Юрый Грыгор'еў;* прафесар кафедры філасофіі і метадалогіі навукі ФФСН *Пётр Карака;* в. н. с. лабараторыі прыкладной электрадынамікі НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі *Валерый Кныш;* намеснік начальніка ГУН *Мікалай Касцюк;* дацэнт кафедры агульнай фізікі фізічнага факультэта *Ірына Мядзведзь;* дацэнт кафедры нямецкай мовы гуманітарнага факультэта *Наталля Смірнова.*

* * *

СТЫПЕНДЫІ Прэзідэнта Беларусі на 2015 год прызначаны 9 аспірантам БДУ. У іх ліку: Ганна Барабошына, Дар'я Грыгор'ева, Вольга Жукоўская, Таццяна Кісялёва, Станіслаў Канстанцінаў, Артур Кухарэнка, Алена Мікітчук, Алег Насань і Уладзіслаў Палонік. Маладыя даследчыкі працуюць па прыярытэтных навукова-тэхнічных кірунках. Многія з іх маюць акты пра ўкараненне ў вытворчасць, лячэбную практыку, адукацыйны працэс, патэнты на вынаходствы.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

НАША СПАДЧЫНА

БАРАЦЬБА ЗА ЖЫЦЦЁ

«Навошта мне займацца гэтымі паперкамі, паддобрывацца да «патрэбных людзей», выслухваць прыдзіркі зайздроснікаў, якія прайшлі праз мяне пры падрыхтоўцы дыпломаў і дысертацый. З-за гэтай пустой мітусні я магу не паспець зрабіць столькі цікавай і патрэбнай працы. А мне ж так дарагі мой час!»

Памяці А. Д. Коўрыкава

Нарадзіўся Аляксандр Дзмітрыевіч КОЎРЫКАЎ 9 лютага 1937 г. у Мінску. Жыў на вуліцы Шчорса разам са сваёй бабуляй-матухнай Дар'яй Рыгораўнай. Лёс іх сям'і быў цяжкі. Дзядуля і бабуля (Ілья і Дар'я Харытановічы) былі раскулачаныя і сасланыя ў Сібір, дзе дзядуля загінуў. Толькі трынаццацігадовы бацька Аляксандра быў папярэджаны і збег. Ён з'ехаў, паступіў вучыцца ў тэхнікум, стаў камсамольцам. Але пасля артыкула «Кулацкае насенне гуляе на свабодзе» бацьку вылічылі і яму прыйшлося збегчы далей – у Расію. Там ён змяніў прозвішча, імя, імя па бацьку і стаў Коўрыкавым Дзмітрыем Якаўлевічам. Толькі перад самай вайной ён вяртаецца на Радзіму, у Мінск, дзе ў яго з'яўляецца сям'я і сын Аляксандр.

З пачаткам вайны Дзмітрый Коўрыкаў заклікаецца ў войска, а сям'я застаецца ў вёсцы Хальч. Праз некаторы час гіне маці Аляксандра, яна была застрэленая фашыстамі. Дзеці трапляюць у канцлагер «Чырвоны Бераг» у Жлобінскім раёне, а пасля ў «Дзіцячае сяло Скаброўка» пад Пухавічамі, дзе малалетніх вязняў трымалі як «расходны матэрыял». Пасля таго як партызаны, пасля некалькіх няўдалых спроб, вызваляюць дзяцей, ледзьве жывы Саша трапляе ў вёску да сваёй бабулі Дар'і, якая была гатовая да самага горшага, бо хлопчык паміраў, урачы адводзілі яму ўсяго два тыдня жыцця. Але здарыўся цуд! Бабуліна любоў і вера вярнулі Сашу да жыцця, ужо праз тыдзень ён змог самастойна хадзіць.

Аляксандр Коўрыкаў (злева) удзельнічае ў правядзенні клінічных выпрабаванняў комплекса «Пціч»

Пасля вайны яго забірае бацька, але ненадоўга. Саша часова трапляе ў дзіцячы дом, затым у школу, рамеснае вучылішча, а ўжо пасля вяртаецца ў Мінск да сваёй бабулі Дар'і, з якой ужо больш ніколі не расставаўся.

У 1954 г. ён паступае ў Мінскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум на спецыяльнасць «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва». З цягай да ведаў ён ідзе ў «Працоўныя рэзервы», дзе з ахвотай наведвае кружкі радыёфізікі і электронікі. Сам збірае тэлевізар для дарагой бабулі, радыёпрыёмнікі, прайгравальнікі, мікраскопы.

У 1957 г. Саша павінен быў скончыць тэхнікум, але не трапіў на Першамайскую дэманстрацыю і быў выключаны без права абароны ўжо гатовага дыплома.

У 1958 г. яго заклікаюць у войска, дзе высока ацэнілі яго веды, эрудыцыю, працаздольнасць, таварыскасць. Праз год камісія пры палітупраўленні БелВА прысвойвае яму кваліфікацыю кінамеханіка гукавога кіно другой катэгорыі. Тады ж кіраўніцтва воінскай часткі звярнулася да дырэкцыі МІПТ аб тэрміновым рашэнні пытання абароны і выдачы дыплома аб заканчэнні тэхнікума Коўрыкаву А. Д., што і адбылося ў 1960 г.

Пасля дэмабілізацыі Аляксандр ідзе працаваць выкладчыкам па працоўным навучанні ў СШ № 39 г. Мінска. За добрасумленную працу ён атрымлівае рэкамендацыю для паступлення ў 1962 г. на вячэрняе аддзяленне ў БДУ імя У. І. Леніна па спецыяльнасці «радыёфізіка і электроніка». Пасля заканчэння ўніверсітэта яго залічваюць на пасаду механіка навучальна-вытворчых майстэрняў, з наступным пераводам на пасаду радыёмайстра па дакладных механізмах.

Прафесійныя якасці Аляксандра былі высока ацэненыя ва ўніверсітэце. Пры зацвярджэнні новых тэм кіраўніцтва першым выканаўцам прызначыла А. Д. Коўрыкава, які меў права карыстання закрытым бібліятэчным фондам пры распрацоўцы прылад касмічнага і спецыяльнага прызначэння.

1968 год – лёсавызначальны ў жыцці Аляксандра, ён не толькі заканчвае ўніверсітэт, але і сустракае будучую жонку Леанору Скрыган, якая таксама працуе ў БДУ. Іх сумесная праца прыносіла добры плён.

Рэдкі выпадак, але ў энцыклапедыю «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь. 1999 г.» А. Д. Коўрыкаў патрапіў, не маючы навуковай ступені.

Не з'яўляючыся навукоўцам на паперы, ён быў навукоўцам ад Бога. Аляксандр Дзмітрыевіч з'яўляецца аўтарам больш за 90 навуковых прац і патэнтаў, яму належаць такія распрацоўкі, як сістэма аўтаматычнага кантролю параметраў фазавых антэнных рашотак; сістэма прыёму-перадачы інфармацыі па лазерным промні; пірометры для медыцынскіх мэт. Ён суаўтар такіх патэнтаў, як спосаб лячэння мясцовараспаўсюджаных нізкадыферэнцыяваных і генералізаваных сарком мяккай тканкі; спосаб лячэння неаперабельных злаякасных пухлін печані; спосаб дыягностыкі пухлін малочнай залозы; спосаб комплекснага лячэння распаўсюджаных і рэцыдыўных форм злаякасных пухлін і інш.

Упершыню ў свеце ім быў распрацаваны і ўкаранёны камп'ютарызаваны комплекс агульнай электрамагнітнай гіпертэрміі «Пціч», які з дапамогай высокай тэмпературы дазваляе змагацца з анкалагічнымі захворваннямі. Праца вялася ўніверсітэцкімі навукоўцамі сумесна з калегамі з РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава і стала для А. Д. Коўрыкава справай жыцця. Дадзены комплекс вярнуў здароўе тысячам людзей, а закладзеныя ў ім ідэі разышліся і працуюць па ўсім свеце.

Усё дасягненні таленавітага навукоўца патрабавалі не толькі часовых і фізічных выдаткаў, але і псіхалагічных, бо першыя ўзоры выпрабоўваліся на сабе. І гэта адбілася на здароўі Аляксандра Дзмітрыевіча.

У 1996 г. пры распрацоўцы свайго чарговага «цуд-апарата» – аўтаматызаванай сістэмы сачэння за станам хворага з запісам на ПЭВМ-386 гіпертэрмічнай працэдуры – Аляксандр Дзмітрыевіч, як заўсёды, выпрабоўвае апарат на сабе. Хваляванне, недапрацоўкі электрыкаў адбіліся на здароўі – мігальная арытмія, што прывяло да шпіталізацыі. Але ў БДУ не могуць знайсці замену таленавітаму навукоўцу, і ён працягвае працаваць далей, а таксама, як і раней, удзельнічае ў правядзенні гіпертэрмічных працэдур. 6 снежня 2013 г. Аляксандра Дзмітрыевіча не стала.

Ён быў сапраўдным чалавекам, працавітым, настойлівым, удумлівым, катэгарычным. Дзеля сваёй улюбёнай справы быў гатовы на любыя ахвяры, а вось кар'ера, званні, навуковыя ступені яго не цікавілі. Аляксандр Дзмітрыевіч так і не абараніў дысертацыю, хоць матэрыялу для яе было набрана звышдастаткова. Гэта сімвалічна, што чалавек, які выжыў пасля варварскіх «медыцынскіх» вопытаў і стаў сведкам столькіх смерцяў, прысвяціў сябе выратаванню чалавечых жыццяў, нібы імкнучыся выправіць наступствы несправядлівай жорсткасці вайны.

Дар'я ПРЫГОДЗІЧ,
супрацоўнік музея гісторыі БДУ

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

Таямніцы і чароўнасці «Каменнай казкі»

Пад такой назвай у БДУ ўжо ў 50-ы раз заіскрыцца каляровай палітрай міжнародная выстава мінералаў і вырабаў з іх. Ладзіцца яна напрыканцы зімы, з 24 па 28 лютага.



Асноўная мэта выставы-кірмашу – паказаць прыгажосць, непаўторнасць камянёў і сапраўднае ювелірнае мастацтва высокай якасці, а таксама цудоўныя вырабы іншых майстроў, якія працуюць з прыроднымі матэрыяламі. Наведаўшы выставу, кожны зможа пераканацца, што камяні – сапраўды вялікая таямніца, магія і прыгажосць. Іх яшчэ называюць каляровымі вачамі Зямлі, якія глядзяць на нас і могуць распавядаць пра тайнікі скрытага ў ёй жыцця. Нездарма з даўніх часоў з камянямі звязаны разнастайныя легенды і паданні, яны станавіліся не толькі ўпрыгожваннем, але і талісманам, захоўваючы чалавека ад хвароб і бед.

Захапляльнае, радаснае здзіўленне, няспыннае жаданне пазнаваць дорыць чалавеку векавечная гармонія каменнага свету. Кожны чалавек, трапляючы ў «Каменную казку» зачароўваецца прыгожай майскай зелянінай малахітаў, хрызапразаў, ізумрудаў, струменістым бэзавым туманам чараітаў, залацістымі промнямі астрафілітаў і іншых самацветаў. На выставе можна сагрэцца іскрыстым сонечным праменьчыкам бурштыну, пазнаёміцца з чароўнымі крышталямі, якія ўражваюць дасканаласцю, суразмернасцю формаў і сіметрыяй.

У наведвальнікаў выставы заўсёды ёсць магчымасць атрымаць парады спецыялістаў, вызначыць сапраўднасць камянёў. Кожны дзень праводзяцца розныя мерапрыемствы: выступленні навукоўцаў, дэманструюцца прэзентацыі і выставы, фотагалерэі і інш. Штодня працуе вучэбная гемалагічная лабараторыя. Акрамя таго, цікаўныя змогуць знайсці літаратуру па мінералогіі, петраграфіі, палеанталогіі, альбо папулярныя выданні пра камяні – такія кнігі можна будзе набыць у прыватных калекцыянераў.

У гэтыя дні ва ўніверсітэце, як добрыя знаёмыя, могуць сустрэцца майстры ювелірнай справы, калекцыянеры, госці з Беларусі, Украіны, Расіі і іншых краін.

«Каменнае царства» чакае вас, шаноўныя. Скарыстайце магчымасць сутыкнуцца з мірам прыгожага, бліжэй пазнаёміцца з магічнымі «прынцамі» і «прынцэсамі», і «Каменная казка» стане для вас, вашых знаёмых і дзяцей музыкай добрых ўспамінаў.

Выстава будзе ладзіцца ў галоўным корпусе БДУ. Тут з 11 да 20 гадзін будуць рады бачыць кожнага.

На геаграфічным факультэце ў музеі землязнаўства чакае яшчэ сюрпрыз. Кожны, хто завітае сюды, зачаруецца дзівоснай гармоніяй і недасяжнай прыгажосцю таямнічых квітнеючых «каменных фіялак» – аметыстаў. Нагадаем, што 10 унікальных бразільскіх камянёў былі перададзены музею рашэннем спецкамісіі Міністэрства культуры нашай краіны па захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей. Між іншым, у музеі ўжо былі падобныя мінералы, прывезеныя з другіх рэгіёнаў, але жэоды з Паўднёвай Амерыкі спецыялісты адносяць да самых прыгожых геалагічных знаходак.

Валянціна СМАЛЯКОВА,
загадчык музея
землязнаўства БДУ

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Кафэ-бістро ў БДУ з інтэрнетам, настольнымі гульнямі і …пледамі

Камбінат грамадскага харчавання БДУ абслугоўвае ўсе падраздзяленні нашага ўніверсітэта. Яго новы дырэктар Жанна ВАРАНКЕВІЧ адразу пачала пераўтварэнні. Першае, што з'явілася з паслуг – гэта ежа на вынас (take away). Аднак каардынальныя змены наперадзе.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

– Жанна Вячаславаўна, тры месяцы таму Вы занялі пасаду дырэктара РВУП «Камбінат грамадскага харчавання БДУ» і ўжо пачалі рэалізоўваць уласныя ініцыятывы…

– Сапраўды, усе сталовыя камбіната ў хуткім часе спазнаюць змены, як ў плане афармлення, так і ў сферы дадатковых паслуг. Некаторыя з іх будуць пераўтвораны ў кафэ ці бістро і пачнуць працаваць у вячэрні час. Гэта датычыцца сталовай Інстытута журналістыкі і буфета № 8 на вуліцы Курчатава. Фінансаваць мадэрнізацыю гэтых устаноў будуць інвестары, якія з'яўляюцца пастаўшчыкамі прадукцыі на камбінат.

План па пераўтварэнні сталовай на Кальварыйскай, 9 ужо падрыхтаваны і чакае ўзгадненя. На рэканструкцыю аб'ект закрывацца не будзе. Яго пераабсталяванне будзе праводзіцца ў суботу і нядзелю. У памяшканні сталовай збіраемся устанавіць дзве канвейерныя стужкі самаабслугоўвання. Павінна з'явіцца VIP-зала з зачыненымі дзвярыма, а таксама тэлевізары для прагляду тэлеперадач і бесправадны інтэрнет. Наведвальнікам VIP-залы, калі тыя гэтага пажадаюць, будуць выдавацца нават пледы. Газеты, часопісы і кнігі змогуць пачытаць усе. Паліца з літаратурай будзе прымацавана ў вялікай зале кафэ. Акрамя гэтага моладзевая аўдыторыя зможа пакарыстацца настольнымі гульнямі, такімі, як УНА, МАНАПОЛІЯ, ДАМІНО. Кожны з гасцей зможа выбраць меню па свайму густу. Яго меркаваныя назвы гавораць самі за сябе: «Пад час сесіі і напружанай працы», «Поснае», «Вегетарыянскае», «Спартыўнае харчаванне», «Для сапраўдных мужчын» і іншае. Акцэнт будзе зроблены на натуральныя інгрыдыенты: піцу, бургеры, салаты, сушы, славянскую і беларускую кухню (дранікі, манты, супы).

Мы збіраемся перавесці кафэ на працяглы рэжым працы. З 10. 00 да 16. 00 яно будзе прапаноўваць даступныя па цане для студэнтаў абеды з нацэнкай у 50 %. З 16. 00 да 23. 00 нацэнка на стравы ўжо вячэрняга меню падымецца да 100 %.

Аднак студэнты БДУ і ў гэтым выпадку атрымаюць зніжку ў 10 – 15 % пры прад'яўленні студэнцкага білета. Наогул, яны будуць абслугоўвацца ў кафэ на выгадных умовах. Напрыклад, прапанова «Больш лепш» дасць магчымасць купляць ім тры кактэйлі па цане 2-х, 5 чызкейкаў па цане 4-х і г. д. Прапанова «Вялікая кампанія» дазволіць студэнтам з 10 чалавек дадаткова да асноўнага заказу бясплатна атрымаць піцу або яе эквівалент роўны суме ў 50 тыс. рублёў. Побач з надпісам «Журфак рэкамендуе» яны змогуць заўсёды знайсці «Страву дня», кошт на якую будзе зніжаны на 5 %. Заўважана, што студэнты часта сутыкаюцца з праблемай, дзе з групай адсвяткаваць свой дзень нараджэння. У кафэ яны могуць дадаткова атрымаць у падарунак торцік і набор святочных свечак, а таксама замовіць імянінніку любімыя музычныя кампазіцыі, зразумела, пры ўмове заказу асноўнага меню на пэўную суму. Думаю, што ўсе нашы прапановы спадабаюцца студэнтам. З таго часу, як адкрыецца кафэ, ім не патрэбна будзе шукаць іншае месца ў горадзе, каб сустрэцца вечарам за кубачкам кавы ці гарбаты, пазнаёміцца, пагаварыць. Іх выкладчыкі таксама не застануцца ў накладзе. Для іх – карпаратыўныя мерапрыемствы. Кафэ возьмецца абслугоўваць і навуковыя канферэнцыі, якія праводзіць Інстытут журналістыкі.

– Якія яшчэ ўстановы грамадскага харчавання БДУ будуць мадэрнізаваныя?

– Бачу, што ў буфета № 8 у Шчомысліцы ёсць патэнцыял для пераўтварэння ў піцэрыю. Паколькі там закрытая зона і моладзі больш няма дзе паесці, а перапынкі паміж заняткамі невялікія, то ў гэтым выпадку якраз для перакусу падыдзе піца або гамбургер, усемагчымыя салаты і закускі. Піцэрыя таксама будзе дзейнічаць пазней, чым зараз працуе буфет, магчыма, да 22.00.

Вельмі б хацелася рэарганізаваць сталовую хімкорпуса. Сталовая, у тым выглядзе, у якім яна зараз існуе зусім нерэнтабельная і не прыносіць прыбытку. Аднак працаваць трэба. Хутка ёй будзе перададзены буфет, які размяшчаецца на Маскоўскай, 5. Пасля наваўвядзенняў там таксама пачне функцыянаваць кафэ-бістро. У сувязі з гэтым нам хацелася б, каб тэрыторыя хімкорпуса, якая аддадзена ўстановам грамадскага харчавання з боку, была вернута назад. Бо КГХ БДУ ў стане аказваць любыя паслугі студэнтам і супрацоўнікам ўніверсітэта.

Дадам, што цэх кандытарскіх вырабаў, які прыносіць найбольшы прыбытак, таксама застанецца пад увагай. Мы пастараемся парадаваць студэнтаў і выкладчыкаў новай выпечкай. У хуткім часе яны змогуць паспрабаваць дысерт, круасаны, пірожнае «Напалеон» і «Мядовае».

Мы імкнёмся выпрацаваць адзіны і непаўторны стыль для ўстаноў грамадскага харчавання БДУ са сваім аднолькавым асартыментам страў і напояў. У стварэнні стылю немалую ролю пачнуць адыгрываць назвы аб'ектаў.

У афармленні інтэр'ера сталовых і кафэ важна, каб у будучым прысутнічаў цёплы тон, які б садзейнічаў добраму апетыту. Гэта могуць быць усемагчымыя адценні тэракотавага, бежавага і аліўкавага колераў. Спачатку мы хацелі прывязацца да лагатыпу БДУ і выкарыстаць блакітны і сіні колеры. На жаль, гэтыя адценні, якія прыгодныя для добрай разумовай працы, для грамадскага харчавання не зусім падыходзяць. У паняцце стылю яшчэ ўваходзяць вывескі, рэклама, мэбля, персанал. Усе гэта таксама зазнае змены.

– Планаў вельмі шмат. Ці атрымаецца іх рэалізаваць?

– Ажыццявіць усе планы адразу не магчыма. Трэба рабіць усё паступова. У мяня ёсць асобны план на кожны аб'ект грамадскага харчавання ва ўніверсітэце. Зараз мы адкрываем буфет у толькі што адрамантаваным інтэрнаце №3. Затым возьмемся за сталовую на Кальварыйскай, 9. Пазней падыдзе чарга і буфета на вуліцы Курчатава ў Шчомысліцах.

Я пазітыўны чалавек і ўсіх заражаю гэтым пазітывам.

– Перамены павінны дапамагчы павысіць рэнтабельнасць прадпрыемства …

– У такіх вялікіх арганізацыях, як БДУ, камбінат грамадскага харчавання заўсёды будзе рэнтабельным. У студэнцкіх сталовых нацэнка на абедзеннае меню невялікая, усяго 50 працэнтаў. Аднак паколькі сталовых і буфетаў ва ўніверсітэце шмат, то таваразварот застаецца на высокім узроўні, што ўплывае на рэнтабельнасць. Аднак для таго, каб яна была яшчэ большай, варта павялічыць асартымент і якасць страў.

Першай прыкметай, што асартымент і якасць ежы сталовай адпавядае, з'яўляецца колькасць наведвальнікаў. Калі я захожу ў сталовую, і назіраю наплыў людзей, то гэта для мяне добры знак. Бывае, што я наўмысна станаўлюся ў чаргу, каб праверыць якасць абслугоўвання ў нашых установах харчавання. І іншы раз мне не хапае часу, каб дастаяць да канца. Апошнім часам я кожны дзень адсочваю колькасць наведвальнікаў па чэках.

Як новы кіраўнік КГХ магу засведчыць, што асартымент страў ва ўніверсітэцкіх сталовых у параўнанні з іншымі ведамственнымі сталовымі дастатковы. Цэны на стравы ва ўстановах грамадскага харчавання БДУ невялікія і даступныя. Нашы студэнты і выкладчыкі могуць пачаставацца смачнай выпечкай, наварыстамі супамі, разнастайнымі салатамі і г. д.

Ва ўніверсітэце працуюць вельмі вопытныя павары. Некаторыя з іх гатуюць стравы для супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ на працягу 20 гадоў. Я таксама збіраюся абапірацца на іх вопыт. А вось на раздачы і на зале з'явіцца новы персанал. З новымі барменамі, афіцыянтамі я сама бяруся праводзіць навучанне і ўсемагчымыя трэнінгі.

– Якое ў вас склалася ўражанне ад работнікаў сталовых БДУ?

– Я люблю працаваць з персаналам, ставіць перад супрацоўнікамі задачы і матываваць іх. Калі чалавек разумее, што ён патрэбны прадпрыемству, то пачынае працаваць з аддачай. Я пачала размаўляць з людзьмі наконт павелічэння продажу. Спрабую давесці да іх ведама, што ад гэтага будзе цяпер залежыць і заробак. Пакуль мне складана. Бо многія з супрацоўнікаў КГХ ва ўніверсітэце прызвычаіліся прытрымлівацца пэўных паказчыкаў таварazвароту, бо зарабляюць фіксаваныя грошы.

– Паколькі наваўвядзенняў у сферы харчавання ўніверсітэта будзе шмат, то хочацца адразу пра іх даведвацца. Як вы збіраецеся інфармаваць кліентаў?

– Хутка ў нас з'явіцца свой сайт. На ім будзем размяшчаць інфармацыю пра сталовыя камбіната, адлюстроўваць усе нашы паслугі і цэны на іх.

Гутарыла Ганна ЛАГУН

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

1лютага Елсукова Наталля Альбертаўна дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі

6 лютага Норман Барыс Юсцінавіч прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства

8 лютага Чаркаская Наталля Барысаўна начальнік упраўлення арганізацыйнай работы і дакументацыйнага забеспячэння

13 лютага Васілевіч Рыгор Аляксеевіч загадчык кафедры канстытуцыйнага права

19лютага Паставалава Таццяна Аляксандраўна дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права

22 лютага Мядзведзеў Генадзь Аляксеевіч прафесар кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі

23 лютага Ціхаміраў Аляксандр Валянцінавіч дацэнт кафедры міжнародных адносін

27 лютага Альсевіч Ларыса Аляксееўна дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі

Віншуем з Днём нараджэння загадчыка кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ ВАСІЛЕВІЧА Рыгора Аляксеевіча.

Рыгор Аляксеевіч працуе на кафедры з 1998 года на пасадзе загадчыка кафедры.

За гэты час адказнасць, прафесіяналізм, энцыклапедычная адукаванасць, высокі ўзровень арганізаванасці, праяўленыя Рыгорам Аляксеевічам, выклікалі ў яго супрацоўнікаў пачуццё павагі. З удзячнасцю жадаем заставацца тым чалавекам, за якім хочацца ісці і з якім хочацца працаваць. Здароўя, дабрабыту, новых дасягненняў, бадзёрасці, невычарпальнай творчай і жыццёвай энергіі, святочнага настрою.

З юбілеем Вас, паважаны Рыгор Аляксеевіч!
Молоды душою Вы и телом.
Много достижений впереди.
В будущее смотрите Вы смело,
Не свернете с верного пути.
Будьте счастливы, бодры, здоровы,
Заряжайте оптимизмом всех.
И не раз мы соберемся снова
Отмечать очередной успех.

Супрацоўнікі кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

АБ'ЯВЫ

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ эканомікі і кіравання бізнесам;
ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ мастацтваў.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, ДІКСТ БДУ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.

ЎСТАНОВА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА «НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ЛАБАРАТОРЫІ матэматычных метадаў абароны інфармацыі;
СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА навукова-даследчай лабараторыі матэматычных метадаў абароны інфармацыі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, п. 702, НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тел. 209-51-04.

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ВЯДУЧАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі лазернай плазмадынамікі па спецыяльнасці 01.04.03 (радыёфізіка);
НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі інфармацыйных тэхналогій па спецыяльнасці 05.13.11 (матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў і камп'ютарных сетак).

Тэрмін конкурсу – 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.
Дакументы накіроўваць на адрас: 220045, г. Мінск, вул. Курчатава, 7. Тэл.: 212-48-43

ДА ЎВАГІ!

Крадзеж электраэнергіі пагражае жыццю

Нядаўна жыхар Мінска, знаходзячыся ў садовым таварыстве ў Пухавіцкім раёне, спрабаваў самавольна падлучыць зварачны апарат да паветранай лініі электраперадач напругай 10 000 вольт метадам накіду. Нягледзячы на наяўнасць папярэджальных знакаў на апорах лініі электраперадач, ён збудаваў прыстасаванне ў выглядзе жэрдак даўжынёй 7 метраў з металічнымі наканечнікамі і спрабаваў дастаць ім да правадоў лініі. Пры спробе ажыццявіць падлучэнне грамадзянін патрапіў пад напругу і быў смяротна траўмаваны.

На жаль, бестурботныя, а часам і злачынныя, паводзіны людзей праводзіць іх да згубы, ператвараючы электрычнасць у страшную разбуральную сілу і яшчэ раз нагадваючы ўсім, што кожны чалавек павінен адказна ставіцца да пытанняў электрабяспекі, берагчы і шанаваць сваё жыццё і здароўе.

Запомніце! Забараняецца самавольнае падлучэнне электрапрыбораў да ліній электраперадач, пранікненне ў электраўстаноўкі. У адваротным выпадку гэта можа нанесці непапраўную шкоду здароўю, аж да смяротнага зыходу.

П. С. СТАВЕР, дзяржаўны інспектар па энергетычным наглядзе РБ

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПРЫЕХАЛІ НА СПАРТАКІЯДУ, А ПАТРАПІЛІ НА КАНЦЭРТ

Многія супрацоўнікі нашага ўніверсітэта карыстаюцца магчымасцю правесці апошнія выхадныя студзеня не за хатнімі клопатамі ці звычайнымі пакупкамі, а ў спартыўным суперніцтве з сваімі калегамі ва ўтульнай атмасферы «Брыганціны». Да таго гэтым разам удзельнікаў спартакіяды «Здароўе» сярод адміністратыўна-кіраўніцкага складу чакаў яшчэ і прыемны бонус у якасці цудоўнага канцэрту, пра які патурбаваліся службоўцы САК.

Рэктар БДУ Сяргей Абламейка задае тон у більярдзе

Узрушаным гледачам захацелася бліжэй да артыстаў

А пачалося ўсё як звычайна з ад'езду ўдзельнікаў спартакіяды ўвечары пятніцы 30 студзеня ад галоўнага корпуса БДУ двума камфартабельнымі аўтобусамі. Надвор'е тады яшчэ спрыяла прыўзнятаму настрою. Усім невыпадковым пасажырам было прыемна адчуць сябе непасрэднымі ўдзельнікамі ўніверсітэцкіх спаборніцтваў і паспытаць сапраўдны спартыўны азарт. Нагадаў усім, для чаго яны тут сабраліся і капітан зборнай факультэтаў Сяргей Ходзін, які звярнуйся да калег з «фізкультпрывітаннем».

...Прыехалі, размясціліся, расклалі рэчы ды на вячэру. Работнікі сталовай «Брыганціны» як заўсёды знайшлі чым пачаставаць жаданых гасцей. Пасля сябры бавалі час на марозным паветры, у вясёлых кампаніях ды на дыскатэцы. Пэўны час было шумна і гаманліва, але апоўначы ўсе мусілі ўлегчыся спаць, бо трэба было выконваць спартыўны рэжым. А на наступны дзень абрынулася страшэнная слота, якая вымусіла ўнесці змены ў праграму мерапрыемства. На ўрачыстым адкрыцці рэктар паведаміў, што лыжныя гонкі суддзямі адмененыя. Гэта, канешне, не магло парадаваць аматараў зімовых забаў, але астатнія віды давалі магчымасць праявіць сябе.

Па словах галоўнага суддзі Васіля Юшко, да спаборніцтваў спрычыніліся 4 каманды-заўсёднікі спартакіяды. Сфарміраваныя зборныя ВНУ выступілі ў 5 відах спорту: більярд, валейбол, настольны тэніс, плаванне і шахматы. У выніку, у більярдзе найлепшай апынулася каманда «ГУН, НДІ і прадпрыемствы», перш за ўсё дзякуючы майстэрскай гульні Сяргей Чайкуна, дырэктара «Шчомысліцы». Добры ўзровень паказалі і прадстаўнікі каманды рэктарата Уладзімір Панарадаў і Аляксей Данільчанка. У шахматах па-за канкурэнцыяй аказалася каманда факультэтаў, вядомая кандыдатам у майстры спорту Аляксеем Забайловічам і намеснікам дэкана юрфака Уладзімірам Курсавым. У плаванні перамога дасталася таксама зборнай факультэтаў дзякуючы свайму лідару ў гэтым відзе – 68-гадоваму «непатапляльнаму» Анатолю Лягчыліну. Сярод жанчын асабліва адзначылася Святлана Наганава з каманды № 4. У настольным тэнісе ўпэўненую перамогу атрымаў сплаў маладосці і вопыта з каманды факультэтаў – «віват!» Івану Роўдзе і Дзмітрыю Ушакову, якія пераўзышлі моцную каманду рэктарата за якую гуляў сам рэктар. Ну і на рэшце самы масавы від – волейбол. Тут разгарнулася ўпартая барацьба, дзе тры каманды здолелі атрымаць па пяць ачкоў. Па розніцы партый заслужаная перамога дасталася камандзе №4 «Цэнтры, філіялы, агульнаўніверсітэцкія кафедры, навучальныя ўстановы комплексу БДУ, іншыя структурныя падраздзяленні і арганізацыі» (капітан – Руслан Папок).

Пасля такога насычанага дня людзям быў патрэбны добры адпачынак. І адміністрацыя «Брыганціны» падрыхтавала для сваіх гасцей сапраўдны сюрпрыз. Па запрашэнні начальніка САК Уладзіміра Палякова перад універсітэцкай супольнасцю выступіў вакальны калектыў, лаўрэат міжнародных фестываляў суперталенавіты сямейны ансамбль «Прасніца» у складзе баяніста-віртуоза Івана Зеленіна, яго жонкі Валянціны і двух дачок-прыгажунь. Жаночае трыа спела беларускія і рускія народныя песні ў эстраднай апрацоўцы, а малодшая Ірына прадэманстравала запальвальны ўсходні танец і касцюміраваную «пляску матылька». Гледачы былі вельмі ўражаны дынамічным відовішчам, горача пляскалі ў аладкі, падтанцоўвалі і напрыканцы нават высыпалі на сцэну, каб быць бліжэй да ўпадабаных артыстаў. Старшыня прафкама БДУ Ігар Вярэнчыкаў ад імя супрацоўнікаў паабяцаў сустрэцца з імі яшчэ не раз.

Агульную ж перамогу ў спартакіядзе «Здароўе», як няцяжка здагадацца, здабыла каманда «Факультэты, Інстытут журналістыкі». Другое месца заняла каманда «Рэктарат, галоўныя ўпраўленні, ўпраўленні». Трэцяе месца дасталася аматарам спартыўных актыўных змаганняў – зборнай супрацоўнікаў цэнтраў, філіялаў, агульнаўніверсітэцкіх кафедраў і інш. Узнагароджанне каманд і індывідуальных пераможцаў адбылося ў нядзелю 1 лютага. Дарэчы, дадзеная спартакіяда пачал ладзіцца па ініцыятыве рэктара БДУ Сяргея Абламейкі і прайшла ўжо ў пяты раз. Гэтым разам у ёй удзельнічала амаль 200 чалавек. Арганізатарамі спартакіяды выступілі пярвічная прафсаюзная арганізацыя супрацоўнікаў БДУ і кафедра фізічнага выхавання і спорту з мэтай папулярызацыі здаровага ладу жыцця, далучэння супрацоўнікаў да фізічнай культуры, спорту і забеспячэння актыўнага адпачынку.

Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Фота Аляксандра СНАПКА

СТУДЭНЦКІ МЕРЫДЫЯН

Моладзь у фармаце адкрытага дыялогу

Год моладзі пачаўся яркай падзеяй, якая задае тон на ўвесь 2015 год.
29–31 студзеня на базе Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках Магілёўскай вобласці прайшоў Рэспубліканскі студэнцкі форум «Моладзь – надзея і будучыня Беларусі», у якім прынялі ўдзел 34 ВНУ.

У трохдзённую праграму форуму былі ўключаны такія мерапрыемствы, як выстава моладзевых праектаў, сустрэча лідараў студэнцкага актыву ў фармаце адкрытага дыялогу «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня» з міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаілам Жураўковым, з намеснікам міністра адукацыі Віктарам Якжыкам, фінал рэспубліканскага спартыўнага спаборніцтва па чэрлідынгу «Формула будучыні: моладзь+здароўе».

Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю БДУ прыняло актыўны ўдзел у форуме: у экспазіцыі выставы былі прадстаўлены, напрыклад, такія грамадзянска-патрыятычныя праекты, як «Святло Вялікай Перамогі» і «У гонар Вялікай Перамогі». Акрамя таго, дэманстраваліся і інавацыйныя праекты цэнтра моладзевых інавацый і прадпрымальніцтва «Start-up БДУ». Лідары моладзевых арганізацый Яўген Харук (старшыня генеральнага камітэта студэнцкай асамблеі БДУ), Павел Лабацэвіч (старшыня савета па якасці адукацыі), Павел Бунос (старшыня ГА «Студэнцкі саюз БДУ») і Вераніка Луд (старшыня кардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ) выступілі з асноўнымі палажэннямі і тэхналогіяй рэалізацыі рэспубліканскага праекта «Адукацыя вачыма моладзі» на сустрэчы з міністрам адукацыі Міхаілам Жураўковым.

Яркай дэманстрацыяй актыўнага развіцця моладзевага спартыўнага руху было правядзенне ў рамках форуму фіналу рэспубліканскага спартыўнага спаборніцтва па чэрлідынгу. Сёння чэрлідынг ужо не прывязаны да пэўных спартыўных падзей, ён – самадастатковая спартыўная адзінка, са сваёй асацыяцыяй, чэмпіянатамі і развітым танцавальным складнікам, які ператварае выступ чэрлідараў у сапраўднае маляўнічае шоу. Прыгажосць, пластыка, цікавая пастаноўка танца і музычнае суправаджэнне каманды Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пацешылі не толькі гледачоў, але і прафесійнае журы. У выніку каманда DanStart пад кіраўніцтвам Дар'і Стрыгінай заняла першае месца ў фінале рэспубліканскага спаборніцтва ў намінацыі «Freestyle team» (спартыўна-танцавальны чэрлідынг з пампонамі).

Насычаная дзелавая праграма форуму, рэалізаваная ўпершыню ў фармаце адкрытага дыялогу, дазволіла студэнцкім лідарам БДУ абмеркаваць асноўныя кірункі развіцця моладзевых грамадскіх арганізацый як з кіраўнікамі міністэрства адукацыі, з рэктарам Горацкай акадэміі, так і са сваімі аднагодкамі. Тры дні форуму аб'ядналі каля 1000 студэнтаў для плённага абмеркавання студэнцкага жыцця, планаў на будучыню і вырашэння праблем.

Атмасфера, настроі, дыскусіі форуму яшчэ раз даказалі, што маладосць з яе высакародным запалам ёсць адна з найвялікіх сіл прагрэсу!

Наталля РАМАНАВА,
намеснік начальніка
ўпраўлення выхаваўчай работы
з моладдзю

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам
інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082
ад 21 студзеня 2010 года

13 лютага 2015 года
Падпісана да друку 11.02.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА

Выконваючы пастаўленыя задачы і ўпэўнена рухаючыся да вызначанай мэты, псіхалагічная служба рапартуе пра паспяховае выкананне заданняў за 15 гадоў дзейнасці, якія прыйшліся на 3 планавыя пяцігодкі. Клопатам і падтрымкай ахоплены самыя шырокія пласты насельніцтва, пашыраецца і памнажаецца колькасць вырашаных псіхалагічных праблем, выкрываюцца ўнутрыасабовыя супярэчнасці, умацоўваецца падмурак устойлівай асобы, удасканальваецца соцыум. Пра змест пяцігодак чытайце ў нашых матэрыялах.

2000–2005 гг.

Ініцыятыва, «асуджаная» на поспех!

У канцы 20 стагоддзя ў сістэме вышэйшых навучальных устаноў сталі фарміравацца сацыяльна-псіхалагічныя службы. Уводзіліся пасады педагогаў-псіхолагаў, ствараліся даследчыя псіхалагічныя лабараторыі, запрацавалі праблемныя групы. Такі працэс назіраўся і ў БДУ. Яшчэ ў 1997 годзе ў штатны расклад студэнцкага гарадка ўніверсітэта былі ўведзены 2 адзінкі педагога-псіхолага.

Апошні зімовы дзень, 29 лютага 2000 года, стаў днём нараджэння псіхалагічнай службы як структурнага падраздзялення ўніверсітэта. Адпаведны загад БДУ зацвердзіў палажэнне пра службу, структуру і штатны расклад.

Першым начальнікам псіхалагічнай службы БДУ была прызначана загадчыца кафедры псіхалогіі кандыдат псіхалагічных навук Людміла Савацьеўна Краўчанка. З верасня гэтага ж года запрацаваў кансультацыйны кабінет, а ўвесну 2001 года стартаваў першы сацыяльна-псіхалагічны трэнінг.

У 2003 годзе пачынае працаваць інфатэлефон, па якім кваліфікаваны адказ на хвалюючыя пытанні можа атрымаць любы студэнт універсітэта. Стартуюць трэнінгі з вялікімі групамі (150–200 удзельнікаў) – своеасаблівае ноу-хау псіхалагічнай службы. Дадзеная форма працы паспяхова зарэкамендавала сябе. З ёй знаёмыя і сучасныя студэнты, якія хоць бы раз выехалі на базу САК «Брыганціна».

У студзені 2004 года псіхалагічную службу ўніверсітэта ўзначаліў Руслан Пятровіч Папок, які змяніў на гэтай пасадзе Святлану Міхайлаўну Шырко.

І з гэтага ж года стартуюць шматлікія праекты, якія эфектыўна працуюць дагэтуль. Так, у сакавіку адбылося ўрачыстае адкрыццё студэнцкага псіхалагічнага клуба БДУ, а праз некаторы час на базе клуба для падтрымкі ініцыятыў студэнтаў запрацавала творчая майстэрня. Спецыялісты службы пачынаюць аказваць дапамогу студэнтам, якія выязджаюць з сацыяльнымі акцыямі ў дзіцячыя дамы, хоспісы, рэабілітацыйныя цэнтры.

За пяць першых гадоў працы ўзрасла запатрабаванасць кансультацый, якія праводзяцца службай, навучальных семінараў і трэнінгаў, наладзілася эфектыўнае ўзаемадзеянне са шматлікімі структурнымі падраздзяленнямі ўніверсітэта – факультэтамі, інтэрнатамі, упраўленнямі, грамадскімі моладзевымі арганізацыямі, а ў прафесійным асяроддзі ярка загучалі публікацыі спецыялістаў службы. Першая пяцігодка апынулася насычанай падзеямі. Гэта быў яскравы старт, які, як жартуюць многія, быў асуджаны на поспех!

2005–2010 гг.

Наватарства і прафесіяналізм

Новы этап працы псіхалагічнай службы адзначаны пастаноўкай важнай задачы – абагульніць назапашаны досвед і аб'яднаць разрозненыя мерапрыемствы ў буйныя праекты, стаць першакласнай базай для павышэння псіхалагічнай пісьменнасці студэнцкай моладзі. Можна з упэўненасцю сказаць, што служба атрымала поспех у рашэнні дадзенай задачы.

У лютым 2005 года для студэнтаў актыву БДУ з поспехам праходзіць навучальны семінар «Сацыяльнае ўзаемадзеянне», прымеркаваны да пяцігоддзя службы. Больш за 150 студэнтаў БДУ, а таксама запрошаныя студэнты актыву іншых універсітэтаў краіны прынялі ўдзел у ролевых гульнях, працы шматлікіх майстар-класаў, групавой дыскусіі, псіхалагічным капусніку.

У 2006 годзе зацверджана серыя выданняў «Псіхалагічны спектр пазнання». Убачылі святло цікавыя навучальна-метадычныя дапаможнікі: «Эмацыйна-валявая самарэгуляцыя», «Правілы паспяховага студэнта» і іншыя. А ў лістападзе 2006 года на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі стартаваў адзін з ключавых праектаў псіхалагічнай службы – «Дні псіхалогіі». У наступныя гады на іншых факультэтах універсітэта будзе рэалізавана яшчэ 12 падобных праектаў, агульная колькасць удзельнікаў перавысіць 4000 чалавек.

2007 год адзначаны вельмі важнай для службы падзеяй. Па ініцыятыве студэнтаў праходзіць конкурс на найлепшы знак псіхалагічнай службы БДУ. Пераможцам конкурсу стаў студэнт фізічнага факультэта Аляксандр Крыштафовіч. Распрацаваны ім знак у поўнай меры адлюстроўвае сферу дзейнасці псіхолагаў універсітэта: стылізаваная літара ψ («пси»), прынцып працы (знак кола з упісанай назвай службы як «кола балансу»), сацыяльная прастора (галінка ведаў – знак БДУ). Знак пачынае выкарыстоўвацца ў дзейнасці службы, а таксама займае сваё законнае месца на ўніформе супрацоўнікаў.

З верасня 2008 года на факультэтах БДУ рэалізуецца праект «Дыстанцыйнае псіхалагічнае тэсціраванне». Атрыманыя дадзеныя дазваляюць студэнтам вызначыць свой бягучы статус, абраць эфектыўную стратэгію адаптацыі, выпрацаваць тактыку выбудоўвання пазітыўнага ўзаемадзеяння з іншымі студэнтамі, выкладчыкамі і бацькамі. У далейшым праект становіцца штогадовым мерапрыемствам.

Калектыў псіхалагічнай службы ўвесь час знаходзіцца ў пошуку новых ідэй. Пацверджанне гэтаму – з'яўленне новага праекта «Фестываль практычнай псіхалогіі» (вясна 2010 года). Цікавая і насычаная праграма фестывалю складалася з 14 мерапрыемстваў і была рэалізавана больш за на 7 пляцоўках БДУ. Апроч спецыялістаў службы, актыўнымі ўдзельнікамі праекта сталі запрошаныя калегі са структурных падраздзяленняў універсітэта, сацыяльна-псіхалагічных цэнтраў, розных міністэрстваў і ведамстваў. Нарэшце, з восені 2010 года выдаецца бюлетэнь псіхалагічнай службы, які выходзіць адзін раз у семестр як укладыш у газету «Універсітэт».

Падводзячы вынік, адзначым, што за першае дзесяцігоддзе псіхалагічная служба ператварылася ў службу наватарства, высокага прафесіяналізму і майстэрства, стала прыкладам для супрацоўнікаў псіхалагічных службаў іншых арганізацый у тым, як трэба любіць сваю справу і служыць ёй.

2010–2015 гг.

Творчасць і стваральніцтва

Трэцяе пяцігоддзе дзейнасці псіхалагічнай службы БДУ адзначылася новым вітком у развіцці. Набірае абароты праект «Дні псіхалогіі». Зараз спецыялісты службы гасцююць адначасова на 2–3 факультэтах.

У лістападзе 2012 года да псіхалагічнай службы далучаецца цэнтр перспектыўнага дзяцінства БДУ. Шэрагі супрацоўнікаў папаўняюцца высакакласнымі спецыялістамі ў галіне сямейнага выхавання, што дазваляе значна пашырыць спектр мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне ў студэнцкай моладзі культуры сямейных адносін. Пасля пачынае працаваць першая праграма сямейнага выхавання студэнтаў БДУ.

Яшчэ адна важная агульнаўніверсітэцкая праграма «Адаптацыя замежных студэнтаў да ўмоў і патрабаванняў адукацыйнага працэсу ў БДУ» распрацавана ў 2012 годзе паводле пастановы Вучонага савета ўніверсітэта. Асноўным выканаўцам праграмы стала псіхалагічная служба.

У гэты ж перыяд падпісаны загад пра фестываль практычнай псіхалогіі. Фестываль арганічна ўключыў у сябе мерапрыемствы, якія станоўча сябе зарэкамендавалі падчас Дзён псіхалогіі: экспрэс-дыягностыку, інтэрактыўную выставу, алімпіяду, практычныя заняткі. Зараз гэтыя і шматлікія іншыя мерапрыемствы праводзяцца на факультэтах і ў інтэрнатах на працягу навучальнага года.

Увесну 2013 г. прайшоў «Тыдзень сям'і», у рамках якой на працягу 5 дзён было праведзена больш за 20 мерапрыемстваў. Самай характэрнай падзеяй стаў конкурс «Найлепшая студэнцкая сям'я БДУ». Пераможцаў конкурсу дэлегавалі для ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе «Студэнцкая сям'я».

«Свята мудрасці і дабрыні», прымеркаваныае да Міжнароднага дня пажылых людзей (кастрычнік 2013 г.), – наш унёсак у справу ўмацавання міжпакаленных сувязяў, павышэння

ступені інфармаванасці студэнтаў пра супрацоўнікаў універсітэта, іх ролю ў развіцці грамадства.

Гэтай жа восенню ў перадпачатку штогадовага восеньскага свята Дня маці спецыялісты псіхалагічнай службы і Фундаментальнай бібліятэкі правялі мерапрыемства «Пад полагам матчынага кахання». Лейтматывам свята стала падзяка маці за яе працу і бескарыслівую ахвяру дзеля сваіх дзяцей.

«Універсітэт – тэрыторыя здароўя» – пад такім лозунгам па ініцыятыве службы ўвесну 2014 г. прайшла агульнаўніверсітэцкая кампанія «Тыдзень здароўя». На працягу шасці дзён студэнтам, супрацоўнікам і запрошаным спецыялістам былі прадстаўлены больш за 30 мерапрыемстваў рознага фармату: выставы, майстар-класы, віктарыны, сацыяльныя акцыі і інш.

У мэтах папулярызацыі ў студэнцкім асяроддзі прафесій працаўнікоў вышэйшай школы, выхавання ў моладзі імкнення быць прадаўжальнікамі сямейных традыцый псіхалагічная служба выступіла ініцыятарам правядзення свята сямейных дынастый «Лёсам злучаны з БДУ» (май 2014 г.).

У канцы 2014 г. прайшло мерапрыемства «Пад надзейным крылом», прысвечанае першакурснікам, іх маці і педагогам. Душэўная атмасфера свята нікога не пакінула абыякавым.

Такім чынам, гісторыя развіцця псіхалагічнай службы БДУ разнастайная і насычаная падзеямі. Яна дэманструе няпросты, але паступальны шлях стварэння і творчага падыходу да арганізацыі псіхалагічнай дзейнасці ва ўніверсітэце.

Час, наперад!

Псіхалагічнай службе БДУ споўнілася пятнаццаць! А мы і не заўважылі. Мы былі вельмі занятыя: дапамагалі, развівалі, адукоўвалі, ствараліі для студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Шмат праектаў было рэалізавана, але мы не збіраемся спыняцца на дасягнутым. Час рухаецца наперад. Змяняецца жыццё, разам з новым рытмам змяняемся мы і развіваемся разам з тымі, для каго працуем. Мы ствараем новыя праекты і ўвасабляем у жыццё новыя ідэі, глядзім у будучыню і бачым шмат творчых задум, якім трэба рэалізавацца.

Інавацыйныя практыкі псіхалагічнай службы

Сучасны стан айчыннай адукацыйнай сістэмы вышэйшых навучальных устаноў характарызуецца актыўным укараненнем інавацыйных тэхналогій у навучальна-выхаваўчы працэс.

Сёння адной з прыярытэтных формаў дзейнасці псіхалагічнай службы з'яўляецца праца ў статусе адкрытай інавацыйнай пляцоўкі, якую мы разглядаем як месца сустрэчы навукі і практыкі, выкладчыкаў і студэнтаў, месца для дыялогу і дыскусій, рэалізацыі ідэй, суправаджэння наватарскіх праектаў.

Так, у рамках праграмы сямейнага выхавання студэнтаў БДУ цэнтрам сям'і і дзяцінства псіхалагічнай службы распрацаваны і апрабуюцца новыя мадэлі падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця і ўсвядомленага бацькоўства: «Школа ўсвядомленага бацькоўства» і сямейны студэнцкі клуб «Гармонія». Праз выкарыстанне інтэрактыўных тэхналогій (трэнінгі, дзелавыя, ролевыя, імітацыйныя гульні, дыскусіі, акцыі, брыфінгі і інш.) студэнтам даецца ўнікальная магчымасць не толькі атрымаць прафесію, але і падрыхтавацца да сямейнага жыцця і бацькоўства. Будучыя мужы і бацькі авалодваюць сучаснымі ведамі, уменнямі і навыкамі па ўсталяванні гарманічных міжасобасных адносін у сям'і. Таксама маладыя людзі атрымліваюць інфармацыю пра выкарыстанне станоўчага досведу папярэдніх пакаленняў, нацыянальных традыцый у стварэнні і функцыянаванні сям'і.

Напачатку снежня 2014 г. на базе псіхалагічнай службы была адкрыта інавацыйная пляцоўка. Гэта важная і перспектыўная форма ўзаемадзеяння паміж БДУ і Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, накіраваная на аб'яднанне высілкаў у рэалізацыі дзяржаўнай інавацыйнай палітыкі, пабудову новых мадэляў узаемадзеяння навукі і практыкі ў сферы развіцця асобы, адукацыі, рэгіёна, краіны ў цэлым.

Ідэі інавацыйнага пераўтварэння грамадства на аснове партнёрскага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва закладзены ў праекце міжнароднай канферэнцыі «Сацыяльная абарона і здароўе асобы ў кантэксце рэалізацыі правоў чалавека: навука, адукацыя і практыка». Канферэнцыя адбудзецца ў нашым універсітэце ў лістападзе 2015 г.

Выбудоўваючы стратэгію інавацыйнай дзейнасці, мы арыентуемся не толькі на сённяшнія запыты студэнцкай моладзі і супрацоўнікаў БДУ, але імкнёмся хутка адгукацца і на запыты будучыні, каб унесці свой унёсак у інавацыйныя пераўтварэнні грамадства.

Навучанне. Падтрымка. Узаемадзеянне

Псіхалагічная служба ажыццяўляе сваю дзейнасць у цесным супрацоўніцтве са шматлікімі арганізацыямі і падраздзяленнямі ўніверсітэта. Гэта і ГА «БРСМ» БДУ, і пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў, савет старастаў, студэнцкі саюз, студэнцк і савет па якасці адукацыі, савет зямляцтваў, студэнцкія саветы інтэрнатаў і шматлікія іншыя. Плануючы сваю працу, псіхолагі абапіраюцца на запыт адміністрацыі інтэрнатаў і факультэтаў. Шэраг мерапрыемстваў праводзяцца сумесна з упраўленнем выхаваўчай працы з моладдзю, студэнцкім гарадком, Фундаментальнай бібліятэкай і ўпраўленнем па справах культуры.

У БДУ створаны ўсе ўмовы для самарэалізацыі творча адораных студэнтаў. Для іх працуюць шматлікія студыі, гурткі і клубы. Ёсць яны і ў псіхалагічнай службе. Студэнцкі псіхалагічны клуб гасцінна запрашае моладзь універсітэта на свае сустрэчы, гульнятэкі і відэасалоны.

У псіхалагічную службу студэнты звяртаюцца і пры падрыхтоўцы розных праектаў. Напрыклад, пры падрыхтоўцы да конкурсаў «Міс вясна» і «Містар БДУ» дзеці праходзяць цыкл трэнінгавых заняткаў, накіраваных на авалоданне тэхнікамі ўпэўненых паводзін, прамоўніцкім майстэрствам, тэхнікамі здымання напружання і рэлаксацыі. Удзельнікі конкурсу «Лідар года» праходзяць псіхалагічнае тэсціраванне, па выніках якога складаецца асобасны псіхалагічны партрэт. Мэта падобнага тэсціравання – раскрыць найлепшыя рысы і якасці патэнцыйных лідараў.

Супрацоўнікі псіхалагічнай службы прымаюць актыўны ўдзел у выязных семінарах у САК «Брыганціна», дзе праводзяць трэнінгі на камандаўтварэнне з вялікімі групамі студэнтаў, секцыі па рознай тэматыцы і іншыя заняткі. Ну і, вядома, на працягу навучальнага года для студэнтаў, у тым ліку замежных, праводзяцца трэнінгі, трэнінгавыя модулі, практычныя заняткі, псіхалагічныя гасцёўні па актуальнай тэматыцы.

Педагогі-псіхолагі прымаюць актыўны ўдзел у рашэнні праблем студэнцкай супольнасці, аказваюць арганізацыйную, кансультатыўную і інфармацыйную падтрымку студэнцкім арганізацыям універсітэта. Рэкамендацыі, псіхалагічная падтрымка і аптымістычны настрой – гэта толькі частка таго, чым могуць падзяліцца псіхолагі з моладдзю.

Супрацоўніцтва і перспектывы

Універсітэт – гэта дрэва выдатных магчымасцяў для ўсіх студэнтаў і супрацоўнікаў. Даглядаючы яго, клапоцячыся пра яго, мы дапамагаем яму расці. А разам з універсітэтам развіваемся і мы.

Існыя сучасныя тэндэнцыі развіцця беларускага грамадства могуць стаць тымі парасткамі, якія пасля ператворацца ў сапраўдныя дужыя галіны нашага ўніверсітэцкага дрэва. Сёння некалькі такіх галінак ужо добра прыкметныя, і псіхалагічная служба БДУ гатовая іх развіваць.

Адным з перспектыўных кірункаў дзейнасці псіхалагічнай службы з'яўляецца ўмацаванне і развіццё ўнутраных (міжкафедральных, міжпрадметных, міжпакаленных і інш.) сувязяў у БДУ.

У рамках яго рэалізацыі мы мяркуем актыўна спрыяць стварэнню ў БДУ сумесных «аўтарскіх школ» (студэнты + навукоўцы = вынікі крэатыўных даследаванняў на карысць ВНУ, горада, краіны). На шляху ў дадзеным кірунку значная частка нашых высілкаў будзе засяроджана на рашэнні задачы па фармаванні ў дыядзе «студэнт - выкладчык» і трыядзе «студэнты - выкладчыкі - кіраўніцкія (грамадскія) структуры» якасна новых узаемаадносін, заснаваных на ўзаемадапамозе, падтрымцы, разуменні і павазе адзін да аднаго.

Важным кірункам нашай дзейнасці мы лічым удзел службы ў арганізацыі працы па выкарыстанні матэрыялаў псіхалагічнай дыягностыкі для складання «дарожнай карты студэнта» на працягу яго навучання ў ВНУ і станаўлення маладога спецыяліста (прафесіянала, сем'яніна, грамадзяніна краіны).

Не менш значная частка стратэгічнай дзейнасці псіхалагічнай службы накіравана на ўмацаванне і развіццё знешніх сувязяў БДУ з універсітэтамі краіны і замежжа, з прадстаўнікамі розных міністэрстваў, ведамстваў, грамадскіх арганізацый. Рэалізацыя дадзенага кірунку мяркуе правядзенне сумесных акцый, круглых сталоў, брыфінгаў, фэстаў і інш.

Запатрабуецца ўдзел творчага калектыву псіхалагічнай службы ў распрацоўцы і рэалізацыі ўніверсітэцкіх, гарадскіх і рэспубліканскіх праектаў: «Зробім жыццё пажылых людзей яркім», «Сталіца без гвалту», «Пазнай свой раён (горад, краіну) і зрабі яго прыгажэйшым», «Летапіс добрых спраў» і інш.

У якасці інавацыйнай пляцоўкі як формы знешняга супрацоўніцтва мы заўсёды адкрытыя для рэалізацыі любых наватарскіх ідэй.

Дарагія супрацоўнікі, студэнты, сябры і госці ўніверсітэта! Разам мы можам зрабіць вельмі многае для развіцця БДУ як аднаго з вядучых цэнтраў інтэлектуальнага і духоўнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь. Падтрымліваць усіх, хто шчыра выступае за гэта развіццё – і ёсць прызначэннем псіхалагічнай службы.

ПРАГРАМНЫЯ ЗАЯВЫ ПСІХАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ НА ЧАЦВЁРТУЮ ЎДАРНУЮ ПЯЦІГОДКУ

- **Прымножым і пашырым колькасныя і якасныя паказчыкі псіхалагічнага дабрабыту студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.**
- **Навучым спраўляцца з асобнымі несістэмнымі негатыўнымі з'явамі – канфліктамі, стрэсамі, дэпрэсіямі – што ствараюць перашкоды на шляху эфектыўных зносін і самаразвіцця сучаснага адукаванага чалавека.**
- **Створым светлую сучаснасць для будучых спецыялістаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.**
- **Мы ўпэўнена глядзім наперад і выражаем поўную гатоўнасць да новых здзяйсненняў на карысць сацыяльна-псіхалагічнага дабрабыту роднага ўніверсітэта.**

Паважаныя студэнты і супрацоўнікі ўніверсітэта!

Наша місія – спрыяць фарміраванню ў прасторы ўніверсітэта сацыяльна-псіхалагічнага дабрабыту.

Мы праводзім індывідуальныя кансультацыі і групавыя навучальныя заняткі, арганізуем розныя мерапрыемствы, аказваем псіхалагічную дапамогу і падтрымку ў сітуацыях жыццёвых цяжкасцяў, кампетэнтна адказваем на важныя для вас пытанні.

З усімі пытаннямі, заўвагамі, прапановамі пра супрацоўніцтва звяртайцеся па тэлефонах (017) 209 56 07, 259 70 61, 328 60 37.

Шукайце нас таксама ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» (http://vk.com/ps_bsu) і на сайце bsu.by.